Абарона педагагічнай практыкі студэнтамі-завочнікамі праводзіцца ў форме заліку ці кафедральнай навукова-практычнай канферэнцыі, на якой прысутнічаюць усе студэнты-практыканты, прадстаўнікі кафедр і дэканата.

На абарону студэнты прадстаўляюць усе вызначаныя дакументы і здаюць справаздачу аб сваёй вучэбна-выхаваўчай рабоце. Яны могуць выступіць з дакладам (рэфератам, паведамленнем) на псіхолага-педагагічную або метадычную тэму, падрыхтаваным на аснове вывучэння вопыту работы выкладчыкаў ці на аснове асабістага вопыту.

Агульная ацэнка работы кожнага студэнта ўлічвае ўсе бакі яго дзейнасці за перыяд практыкі (вучэбную, творчую, выхаваўчую, даследчую, прафарыентацыйную). Яна выводзіцца на аснове абмеркавання і ўзгаднення думак кіраўнікоў практыкі і членаў камісіі. Выніковую ацэнку за практыку выстаўляе камісія ў складзе кіраўнікоў практыкі і выкладчыкаў кафедры педагогікі і псіхалогіі. Адзнака выстаўляецца ў залікоўку і ведамасць.

Такім чынам, мэты, задачы і змест педпрактыкі на розных формах навучання ва універсітэце адзіныя. Спецыфіка завочнай формы навучання адлюстроўваецца перш за ўсё ў аб'ёме індывідуальных заданняў для студэнтаў з улікам іх месца працы і назапашанага вопыту практычнай работы.

Н.А.Ляйко,
дацэнт Беларускага універсітэта культуры

## АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ ПА АНАЛІТЫКА-СІНТЭТЫЧНАЙ АПРАЦОЎЦЫ ДАКУМЕНТАЎ І АРГАНІЗАЦЫІ КАТАЛОГАЎ

На сучасным этапе, калі рэалізуюцца ідэі гуманізацыі тэхнічнай адукацыі і тэхнізацыя гуманітарнай, адчуваецца неабходнасць у аднаўленні тэарэтычных і практычных ведаў спе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыялістаў, а таксама фарміраванні ў студэнтаў падчас вучобы і практыкі спецыяльных уменняў і навыкаў, гэта значыць, ажыццяўлення ўстойлівай бесперапыннай адукацыі.

Значную ролю ў фарміраванні студэнтаў як спецыялістаў у галіне бібліятэказнаўства і бібліяграфіі адыгрываюць курс “Каталагізацыя дакументаў” і вытворчая практыка па гэтай дысцыпліне, таму што менавіта ў час навуковай апрацоўкі дакументаў і арганізацыі як традыцыйных, так і электронных каталогаў студэнты атрымліваюць сапраўднае ўяўленне аб сваёй будучай прафесіі, аб патрабаваннях да спецыяліста, аб праблемах пры выкананні запытаў карыстальнікаў бібліятэкі.

У сувязі з тым, што на парозе XXI ст. адбыліся значныя змены ў каталагізацыі дакументаў, якая ў 80 — 90-я гады развівалася не толькі эвалюцыйна, але і рэвалюцыйна, каталагізацыя стала як у тэарэтычным, так і ў практычным плане месцам іспытаў на моц, прафесійную і псіхалагічную мабільнасць. У каталагізатараў павінна быць жаданне працаваць па-новаму, умець хутка перавучвацца. Нездарма каталагізатараў называюць піянерамі бібліятэчнай аўтаматызацыі. Карткавыя каталогі паступова і беспаваротна саступаюць месца электронным каталогам. Разам з аўтаматызацыяй мяняюцца многія паняцці аб тыпалогіі і сістэме каталогаў, нарматыўна-метадычнае забеспячэнне каталагізацыі і інш. Таму такое значэнне падчас практыкі надаецца азнаямленню з новай нарматыўна-метадычнай дакументацыяй, дапрацоўцы адпаведных дакументаў і своечасоваму іх выкарыстанню. Справа ў тым, што змены тычацца не толькі своечасовага змястоўнага рэдагавання традыцыйных каталогаў, але галоўным чынам выкарыстання сучасных тэхналогій пры аналітыка-сінтэтычнай апрацоўцы дакументаў, арганізацыі, вядзенні і выкарыстанні электроннага каталога (ЭК). Цяпер усё часцей пры навуковай апрацоўцы дакументаў традыцыйныя працэсы замяняюцца аўтаматызаванымі, з дапамогай якіх папаўняюцца і традыцыйныя каталогі новымі выданнямі, і фарміруюцца электронныя каталогі або адпаведныя базы даных. У сувязі з гэтым унесены карэктывы не толькі ў вучэбны працэс, але і ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вытворчую практыку, у прыватнасці, у заданне па навуковай апрацоўцы дакументаў.

Агульнавядома, што апрацоўка дакументаў складаецца з дзвюх частак: тэхнічнай апрацоўкі дакументаў і аналітыка-сінтэтычнай. Калі першая не патрабуе асаблівых спецыяльных ведаў, то другая частка ажыццяўляецца бібліятэчным работнікам, які не толькі добра падрыхтаваны па курсу "Каталагізацыя дакументаў", але і мае добрыя агульнапрафесіянальныя веды, у некаторай ступені ён павінен быць энцыклапедыстам. Больш за ўсё гэта адчуваецца пры ўкараненні стандартаў, своечасовым выкарыстанні дапрацаваных табліц класіфікацыі, унясенні змяненняў у сувязі з выкарыстаннем новых тэхналогій і інш.

Мы пастаянна падкрэсліваем, што ва ўмовах аўтаматызацыі каталог страціў сваю адасобленасць, абмежаванасць рамкамі адной бібліятэкі. Пры выкарыстанні сучасных тэхналогій бібліятэчныя каталогі ператварыліся ў "вароты", якія адчыняюць чытачам магчымасць карыстацца сусветнай інфармацыяй.

Як карткавыя каталогі саступаюць месца электронным, так і цэнтралізацыя каталагізацыйных працэсаў паступова ўступіць месца кааперацыі і абмену запісамі паміж бібліятэкамі. У першую чаргу ў нашай краіне гэта адносіцца да арганізацыі зводнага электроннага каталога. З аўтаматызацыяй мяняюцца таксама паняцці аб тыпалогіі і сістэме каталогаў. Замяніць сістэму каталогаў можна будзе адным ЭК.

Справа ў тым, што ў публікацыях ЭК звычайна адносяць да формы каталогаў, але не ўпамінаюць сярод відаў каталогаў. З пункту гледжання каталагізацыі, гэта не зусім дакладна. Сапраўды, ЭК азначае не сутнасць, а форму. Але калі прааналізаваць ЭК, унікнуць у яго сутнасць, разглядзець усе віды каталогаў, то заўважым, што ЭК можа ажыццявіць усе віды пошуку, адказаць на ўсе тыпы запытаў, хаця і не групуе бібліяграфічныя запісы па якой-небудзь прымеце.

На наш погляд, гэта заслугоўвае асаблівай увагі, таму што падчас вытворчай практыкі студэнты маюць магчымасць убачыць ЭК у дзеянні, прыняць удзел ва ўсіх працэсах: стварэн-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня ЭК, лінгвістычным забеспячэнні, праблемах выкарыстання, гэта значыць, адчуць вялікую працу пры стварэнні ЭК, заўважыць патрабаванні да спецыялістаў каталагізатараў-аўтаматызатараў, асэнсаваць, што павінен ведаць бібліятэкар-спецыяліст. Разам з добрым валоданнем камп`ютэра неабходна валодаць глыбокімі прафесійнымі ведамі: ведаць увогуле праблемы лінгвістычнага забеспячэння каталагізацыі.

Вельмі добра засваенню ведаў студэнтаў садзейнічае іх праца па рэтраканверсіі ў час вытворчай практыкі. Такім чынам, ужо да практыкі студэнт павінен быць добра падрыхтаваны па курсе "Каталагізацыя дакументаў".

На практыцы студэнт у першую чаргу павінен азнаёміцца з аддзелам апрацоўкі літаратуры, методыкай і тэхналогіяй бібліятэчнай апрацоўкі дакументаў, прааналізаваць якасць і эфектыўнасць выкарыстання сістэмы бібліятэчных каталогаў, арганізацыйна-метадычны апарат каталагізатара, азнаёміцца з раздзяленнем працы па функцыянальнай і галіновых прыметах.

Пры гэтым неабходна абавязкова адзначыць навуковасць і даступнасць, пошукавыя і інфармацыйныя якасці сістэмы каталогаў (паўнату і многааспектнасць раскрыцця саставу і зместу фонду, дакладнасць афармлення і групоўкі бібліяграфічных запісаў; аператыўнасць адлюстравання новых паступленняў і аператыўнасць выдачы інфармацыі). Трэба звярнуць увагу на ўсе паказчыкі якасці каталогаў: функцыянальныя, эрганамічныя, эстэтычныя.

Пасля гэтага ўсе вынікі даследавання і аналізу каталогаў давесці да супрацоўнікаў. Па меры магчымасці зрабіць спробу ўдасканалення каталогаў. Гэта значыць студэнты павінны не проста механічна выконваць заданне на практыцы, а ў кожнай канкрэтнай бібліятэцы старацца ўнесці свой уклад у яе дзейнасць, спробу ўдасканалення каталогаў. У прыватнасці:

— па меры неабходнасці зрабіць удакладненні ў табліцы класіфікацыі;

— адлюстраваць гэтыя змены ў сістэматычным каталогу;

— папоўніць новымі рубрыкамі алфавітна-прадметны паказальнік;

— павялічыць інфармацыю аб каталогах з мэтай павышэння эфектыўнасці іх выкарыстання.

Пры гэтым, на наш погляд, неабходна абавязкова ўсім кіраўнікам (універсітэта і базы практыкі) быць карэктнымі, умець зацікавіць студэнтаў будучай прафесіяй, таму што менавіта падчас практыкі студэнты атрымліваюць сапраўднае ўяўленне аб ёй.

**В.Н.Мароз,**
**мастацкі кіраўнік узорнага вучэбнага тэатра 136-й СШ г.Мінска, выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## ШЛЯХІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ЗМЕСТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ РЭЖЫСЁРСКІХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

Тэатральнае мастацтва з'яўляецца адным з найбольш прывабных з пункту гледжання педагагічнага ўздзеяння на асобу, асабліва ў перыяд яе станаўлення. Гэтым тлумачыцца пастаянны рост колькасці тэатральных студый, спецыялізаваных класаў і нават школ з тэатральным ухілам. Усё часцей на рознага роду конкурсах і фестывалях тэатральнай творчасці можна пачуць: "Мы не самадзейнасць. Мы — тэатр, дзе іграюць дзеці". Гэта адбываецца таму, што зараз большасцю тэатральных калектываў кіруюць людзі, што маюць спецыяльную мастацкую падрыхтоўку. Аднак творчы ўзровень работы і педагагічнае майстэрства кіраўнікоў дзіцячых і юнацкіх калектываў далёка не заўсёды супадаюць. Часам даводзіцца назіраць цікавыя тэатральныя рашэнні і адсутнасць умення знайсці для іх рэалізацыі адэкватныя педагагічныя сродкі, а таксама магчымасць працаваць з юнымі выканаўцамі адпаведна іх узроставым асаблівасцям.

Актуальнасць набывае праблема педагагічнай падрыхтоўкі выпускнікоў рэжысёрскіх спецыяльнасцей Беларускага універсітэта культуры, таму што большасць з іх пачынае свой працоўны шлях менавіта ў якасці кіраўнікоў дзіцячых і юнацкіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ